Modern History Archives
Archiŭ Najnoŭšaje Historyi
Fond 1/11 sprava 1269

ЗА ВАШУЮ І НАШУЮ ВОЛЮ!

# ПРАМЕНЬ

№ 4 ЛЮТЫ 1990 г.
ВЫДАНЬНЕ ЛЕПЕЛЬСКАЙ АБ'ЯДНАНАЙ ГРУПЫ ПАДТРЫМКІ БНФ „АДРАДЖЭНЬНЕ“

## ОДА ФУНКЦИОНЕРАМ

Ах, как мы любим начальство! Хлебом не корми, а дай возможность засвидетельствовать любовь и личную преданность!

Каких только слов мы не находим, чтобы обласкать начальственное ухо: "вождь", "великий кормчий", "отец дорогой" и даже "верный ленинец"! Нет, так любить начальство, как можем мы, никто в мире не может!

И начальники, спасибо им, платят нам той же пылкой любовью: то поднимут тост за великий народ, то назовут гегемоном, то, поклявшись верности идеалам, пообещают через пару недель построить такое светлое будущее прекрасное общество, где всем будет по потребностям, а если вымрет половина населения от радиации, то оставшимся будет по отдельной квартире...

Отдадим же свои голоса на выборах в депутаты партийной номенклатуре! Они искренне позаботятся, чтобы мы видели мыло только по талонам, чтобы ни один грамм радиоактивного мяса не пропал и пошёл на наш стол /себе в этом удовольствии они, в зависимости от занимаемого поста, будут стараться отказать во имя народа/.

Они уж постараются выполнить продовольственную программу за счёт зоны жесткого контроля, решительно пошлют наших сыновей отдать жизнь и здоровье /будь-то Афганистан или Чернобыль/ за свое кресло и портфель, призовут трудиться, не поднимая головы и не задумываясь, что это можно сделать иначе и эффективнее, а так же мужественно присвоят плоды этого труда.

" Нам солнца не надо —
Нам партия светит!
Нам хлеба не надо —
работу давай!"

Школьные стихи довоенных лет настолько гениальны, что не потеряли своего значения и в наши дни! Виват начальству!

Накормить радиацией, присвоить плоды нашего труда, создать дефициты, отнять сыновей — если вы этого хотите — голосуйте за функционеров! Они в прошлые выборы прошли по сельским округам и сейчас будут искать лазейки! А затем с трибуны сравнят: "У нас заказы и у вас заказы..." Только им заказы из Финляндии, а нам — из Чернобыля /можно сказать, заказы на тот свет/.

Проснись, народ!

Подумай, за кого отдать свой голос, кого выдвинуть в депутаты. Помни! История дает нам шанс стать полноправными людьми, отстоять среду своего обитания, стать хозяевами своей земли, своего труда. Мы должны спасать своих детей, пока не поздно! Те, кто уже сейчас живет при коммунизме, в этом не заинтересован, а их лакеи готовы предать мать родную, но спасать портфели и лизнуть руку начальству.

Сейчас от каждого из нас зависит, кто будет представлять народ и чьи защищать интересы.

Ни одного голоса партийной номенклатуре!

Отдадим свои голоса смелым, честным, мужественным, компетентным, болеющим за свой народ людям !!!

К. МАРУШКЕВИЧ.

## ДЗЯКУЕМ ЗА ПАПЯРЭДЖАНЬНЕ

Калі будзеце атрымліваць пасылкі — будзьце асабліва асьцярожнымі пры іх адкрыцьці... Усё магічыма! Беражлівага Бог беражэ!

Посьпехаў вам, родныя сябры!

Л.М. /БНФ/

## АПОВЯДЫ СТАРОГА ЛЕСАВІКА

### БЫЦЦАМ ПАНСКІЯ ЦІВУНЫ

Леташній восеньню на аўтобусны супынак "Барсукі" прыйшла заплаканая старая бабуля, уся мокрая ў сухое надвор"е. Небарака паведала людзям, якія чакалі аўтобуса, што яе ледзь не ўтапіў у балоце ляснічы Бярэзінскага запаведніку, адабраў і выспаў у ваду журавіны/іх бабулька сабрала на лякарства цяцілітровае вядзерца/. Ён жа забраў ці вытрас у балота апошнія капейкі, што старая пакінула на аўтобусны білет.

Пашкадавалі людзі пакрыўджаную адказнай асобай, сабралі грошы ды купілі ёй білет на аўтобус.

На жаль, гэта не адзінкавы выпадак. Падобнае бачу на кожным кроку, бо жыву ў лесе. Ды так даўно, што нават гадоў сваіх зьлічыць не магу. Прызнаюся, такіх зьдзекаў над простым людам не учынялі нават панскія службоўцы. Цікава, хто гэта навучыў так зьневажаць ды прыніжаць народ савецкіх лесаахоўнікаў? Хто адабраў у іх чалавечнасьць, сумленьне, спагаду?

Думаеце, да ўсіх аднолькава адносяцца "вартавыя" запаведнага рэжыму? Як бы ня так! Пэўным асобам ды для пэўных асобаў журавіны ўвосень вывозяцца з запаведнай зоны машынамі. І гэта ў той час, калі дырэктар запаведніку Вайцялёнак абяцае, што ніякіх машын за ягадамі больш ня будзе /гл. райгазэту "Ленінскі сцяг" за жнівень 1989 году/. Але ж сябрам ды начальству не адмовіш! Дык хоць перад старымі кабетамі трэба пафанабэрыцца моцай сваёй улады.

### І Ў ГЛУХАМАНІ ЯК У СТАЛІЦЫ

Сябра БНФ зь дзяржзапаведніку прыйшоў з працы дый кажа жонцы:

— Сёньня я прымаў удзел у забастоўцы! Дзьве гадзіны баставаў па заклiку Фронту.

— Лепш бы ты два тыдні галадаваў, — жонка ў адказ. — Ня трэба было б есьці гатаваць. Вынік адразу б сям"я адчула — харчы вунь якія дарагія.

Дыялог гэты я выпадкова падслухаў 14 сьнежня 1989 году.

ЛЕСАВІК

## ДЫК ХТО Ж ЁСЬЦЬ ХТО?

Калі ў Лепельскай раённай газэце "Ленінскі сцяг" №145 ад 5.12.89. прачытаў артыкул "Дык хто ж ёсьць хто?", адразу падумаў: з-за чаго ж так перапалохаліся лепельскія журналісты? І толькі пазнаёміўшыся з першым нумарам выданьня "Прамень", зразумеў прычыну.

Я зусім не намераны выступаць у ролі арбітра паміж сябрам БНФ У. Шушкевічам і рэдактарам раённай газэты В. Хаванскім ці каменціраваць узьніклую між імі палеміку. Аднак хачу супрацьпаставіць апошнім радкам адкрытага ліста журналістаў рэдакцыі да лепельцаў свае назіраньні за матэрыяламі, якія друкуюцца ў райгазэце.

Адкрыты ліст заклікае: "Калі вы, напрыклад, пасварыліся з суседам або разышліся ў думках з былым таварышам па партыі, па рабоце ці яшчэ што. Не насіце камень за пазухай, не трымайце кукіш у кішэні. Сьмела выліваіце на яго вядро бруду, публічна скажыце ўсё, што пра яго думаеце. Незале-

